ПАКЛАНІСЯ ЗЯМЛІ-КАРМІЦЕЛЬЦЫ

Зямля-карміцелька! Яшчэ далёкія продкі прыкмецілі і пакінулі нам у неўміручую спадчыну сваё адкрыццё: пад сонцам няма больш нічога ні мілей, ні прыгажэй за цябе. А калі чалавек, наш сучаснік, упершыню ўзняўся ў космас і паглядзеў адтуль на цябе, ён не змог утрымацца ад воклічу: «Якая прыгажосць!»

Матуля-зямліца! Сярод шматлікіх дакументаў апошняй вайны, Вялікай Айчыннай, ёсць сціплы фотаздымак 1944 года. На ім увасоблены запамінальны момант: воіны-беларусы, стаўшы на калені і скінуўшы пілоткі, цалуюць цябе, знявечаную і абрабаваную, толькі што вызваленую ад варожай навалы. Франтавому фотарэпарцёру не проста пашчасціла «спыніць імгненне», а ў поўнай меры мовай свайго мастацтва ўдалося сказаць святую праўду і пра цябе, і пра нас.

Зямля нашай бацькаўшчыны! Ты спарадзіла нас, і мы ўсе, як адзін, твае даўжнікі. Да скону дзён. І ў кожнага з нас ёсць адзін-адзінюткі запавет-мара: зрабіць цябе яшчэ больш прыгожай і шчаснай.

Хвала таму, хто імкнецца да гэтага праз усё сваё жыццё — і ў дзень пагодны, і ў нягоду.

Нягоду прынеслі паўночныя вятры. Трое сутак запар яны вар'яцелі над палескімі абшарамі, узнімаючы ўздоўж палявых дарог, над пе-

расохлымі меліярацыйнымі каналамі слупы бурага тарфянога пылу, ломячы на ўзлесках крохкае стволле сасонніку. На чацвёртыя суткі, уранні, вецер гэтак жа раптоўна аціх, як і ўсчаўся, і тады трошкі апагодзілася. На прыніжаным небасхіле, спрэс загрувашчаным непрыветнымі, сцюдзёна-шэрымі аблокамі, сонца тамсям прахукала колькі акенцаў-адтулін, і на гарызонце зноў заўсміхалася бяздоннае, па-летняму густа-сіняе неба.

Апоўдні над Азяродамі нават паказалася сонца, але яно тут жа схавалася пад крысо цёмна-ліловай хмары, якая спакваля насоўвалася з боку Чучавічаў. Віктар Паўлавіч Шапавал заўважыў хмару неўспадзеўкі, калі за кабінай экскаватара прарэзліва-суха трэснуў пярун. Напачатку яму падалося, быццам пярун ударыў над кабінай, і ён хуценька апусціў стралу экскаватара наколькі мог, мала што не да самага кар'ера, выключыў матор. Дзверцы кабіны былі адчынены, і Віктар Паўлавіч, абціраючы старызнай спацелыя рукі, саскочыў долу. У гэты час над галавой зноў раскацістаглуха гахнуў пярун, усхапіўся вецер, і — быццам неба прадралася: хлынуў праліўны дождж.

Такога дажджу Шапавал не бачыў на сваім вяку. Ні тут, па разлогах так званай Палескай упадзіны — на стыку Ганцавіцкага і Лунінецкага раёнаў, ні ў той вёсцы Калазубы, што на Ружаншчыне, дзе ён нарадзіўся і вырас.

Вёска — двароў на сотню — стаяла якраз каля самага гасцінца Косава-Ружаны, і дажджы, колькі помніць сябе Шапавал, пачыналіся менавіта тут, на гэтым гасцінцы. (Ва ўсякім разе, так яму здавалася). Яны спачатку, у залежнасці ад сваёй моцы, усчыналі лёгкі пошум, збівалі пыл на наезджанай дарозе і толькі пасля паварочвалі на вясковую вуліцу, на іхні панадворак. Сядзіба ў Шапавалаў была невялікая — хата, хлеў, зрублены па-старасвецку, маленькі свіронак, дзе ўлетку звычайна спалі ўсе шасцёра дзяцей,

вось і ўсё. Так што ветру асабліва не было дзе разгуляцца. А дождж без ветру — хіба ж гэта дождж! Затое за сядзібай, там, дзе ў густым алешніку бруіцца самая светлая на зямлі рачулка Вулачка, вось там раздолле. І вятрам, і дажджам.

З сямі гадоў ваколіцы Вулачкі, дзе ён упершыню пачаў пасвіць кароў, вывучыў, як кажуць, назубок. У спёку там раскоша неапісальная — і цянёк, і рачная прахалода, а вось у дождж — хоць ты напраўду каравул крычы: схавацца няма дзе.

Бацька на поўным сур'ёзе называў яго тады сваім памочнікам і таму давяраў самае запаветнае багацце сям'і — карову.

— Глядзі, сынок,— штодня наказваў у дарогу,— лепш чым вока ў ілбе глядзі. Не дай бог чаго...

Ён не дагаворваў, але сын, наслухаўшыся ад суседзяў усякай усячыны, сама што пачынаў разумець многае з таго, аб чым пакуль што змоўчвалі і бацька і маці.

— Тата, скажы мне,— дапытваўся ў бацькі,— чаму нас у вёсцы Палавінкамі завуць?

— Палавінкамі? — уздыхаў бацька.— Гэта, сынок, у нас зямлі адна палавінка. Адсюль і мянушка... Ды ты не глядзі на мяне так, быццам я ў чым вінаваты. Карову вунь лепей даглядай.

І ён стараўся як толькі мог. Прахопіцца, бывала, на досвітку, маці накорміць яго сырадоем з учарашняй бульбай, і — пабег за вароты, дзе ўжо звычайна чакала пастуха суседская скаціна — з дзесятак рагуль. З гэтым статкам ён і адпраўляўся ў Гаёк, невялічкую дуброву за ціхай Вулачкай, і прападаў там увесь дзень. Іншы раз бязлітасна паліць сонца, часам па два, па тры разы на дні наскочыць спорны дождж, прамочыць да апошняй ніткі, але ж не кінеш-рынеш статак без нагляду. У шкоду яшчэ забяжыць, папрокаў не абярэшся ад людзей.

Цярпенне гартавала характар, вучыла стой-

ка пераносіць цяжкасці. Вось ён, прамоклы да касцей, толькі што курчыўся пад няўклюднай алешынай ад холаду, зуб на зуб у яго не трапляў, усё ж вытрываў, не ўцёк пад вясковыя выратавальныя стрэхі. Сунімаўся дождж, сонца зноў сушыла на ім зрэбную апранаху, і адвячоркам пад спачувальныя позіркі вяскоўцаў ён услед за накормленым статкам вяртаўся дамоў.

— А нішто сабе гэты хлопец, цярплівы,— гаварылі пра яго.— Такога голай рукой не возьмеш. Відаць, выйдзе ў людзі Палавінкаў сын.

Усё ж тыя дажджы далёкага дзяцінства не ішлі ні ў якое параўнанне з ліўнем, што буяніў цяпер за кабінай экскаватара над Азяродамі, урочышчам адзічэлым, і таму даўно забытым людзьмі. Маланкі адна за адной бязлітасна паласавалі неба, набрынялыя, ускаламучаныя хмары лілі на зямлю сапраўдныя патокі вады, і за нейкіх тры гадзіны выкапаны Шапавалам канал быў запоўнены амаль што да краёў.

Можна было б пакінуць экскаватар — да стана нацянькі (па бэрвах — кладках на балоце) кіламетры чатыры, не болей, але ж машына! Усякае можа здарыцца ў такую непагадзь. Размоклы торф асабліва падатлівы, можа так стацца, што давядзецца адагнаць экскаватар у больш бяспечнае месца. А дзе яно, такое месца, на балоце? Яго і днём трэба навобмацак шукаць. А цяпер жа ноч.

Ноч была ветранай і дажджлівай. З-пад Чучавічаў на Азяроды нястомна наплывалі навальнічныя хмары, то аціхаў, то зноў злосна скавытаў вецер, раз-пораз пыхліва ятрыўся пярун, і ліў, не перастаючы, дождж. Віктар Паўлавіч залез у кабіну экскаватара, адшукаў за сядзеннем брызентавую куртку, накінуў яе на апашкі, уключыў святло і вылез. Пад падэшвамі кірзавых ботаў зачвякала балота. Пакратаў каля гусеніц грунт, падумаў: «Моцны, не размые» — і зноў шмыгнуў у кабіну.

Прыгадалася такая ж дажджлівая ноч у час яго першай вахты на баявым караблі. Пра што ён думаў тады? І салдаты, і матросы ў далечыні ад родных і блізкіх — і асабліва ў першы год службы, аказваецца, думаюць аб адным і тым жа — аб сваім родным доме. Думаў аб ім і Шапавал. Успамінаў бацьку і маці, дзве дзічкі на агародзе і купчастую рабініну пад акном, братоў — Васіля, Аляксея, Івана, сясцёр — Веру і Зіну, дзядзьку Міхала, які не вярнуўся з вайны — загінуў недзе пад Берлінам. Прыпомніў, як пераросткам у 1944 годзе пайшоў у першы клас, а калі скончыў сямігодку, трэба было ўжо рыхтавацца да службы ў арміі. Прыгадалася... Так, прыгадалася і вясковая мянушка — «Палавінкаў сын», задзела за жывое. Гэта ж мінула столькі часу, у Калазубах цяпер багаты калгас «Першае мая», а мянушка так і засталася. Быццам прырасла.

І менавіта тады, за сотні міль ад родных берагоў, малады воін, як ніколі дагэтуль, выразна, да болю сардэчнага адчуў, што любіць зямлю па-свойму, па-сялянску: крышачку больш за паэтаў-лірыкаў і ні кропелькі не менш за мастакоў-пейзажыстаў. Адно што ні сказаць, ні паказаць гэтага не ўмее. Любіць той невымоўнай любоўю, якая не толькі ўзвышае чалавека, а робіць яго асабліва шчаслівым.

Хіба ж гэта не шчасце — бачыць толькі што ўзаранае поле. Роўнае і бяскрайняе. Пад высокім небам яно ляжыць велічна і горда. Сонца лашчыць яго залатымі промнямі, шчыруюць дажджы, каб асвяжыць, напаіць дасхочу, зухаваты вятрыска палюбоўна цалуе яго пры кожным зручным выпадку. А яно, ціхмянае і добрае, чакае суджанага дня — прыезду сейбіта.

Хіба ж гэта не шчасце — мала што не ўмлець ад захаплення, згледзеўшы, як шугае навакол густа-зялёнае полымя, і няма яму канца-краю. Здаецца тады земляробу, што зарунелае поле спявае.

А разам з ім спяваюць людскія сэрцы, перапоўненыя шчасцем надзеі.

Хіба ж гэта не шчасце — пакратаць рукою неацэнную жаўцізну спелага коласа, моўчкі пастаяць перад магутнай сцяной збажыны, падыхаць спрадвечным водарам хлеба. Не! Што ні кажыце, а менавіта гэта і ёсць ні з чым не параўнальнае шчасце, найвялікшая асалода пачуццяў не толькі хлебароба, а ўвогуле чалавека Зямлі.

Вось пра што думаў тады на вахце Віктар Шапавал. Ён яшчэ не ўяўляў, як складзецца ягоны лёс пасля чатырох гадоў матроскай службы, дзе і кім будзе рабіць, але дакладна ведаў галоўнае для сябе: ён зробіць нешта такое, ад чаго абавязкова забудзецца прыкрая мянушка, а яго вяскоўцы, нават самыя языкастыя, змушаны будуць яшчэ не раз сказаць: «А ўсё-такі ты малайчына Паўлюкоў сын!»

Усё гэта не раз успаміналася пасля службы на флоце, калі ён вярнуўся ў родную вёску. Работы было навалам — і ў паляводстве, і ў жывёлагадоўлі. Цягнула ж да зямлі. І да ведаў. Давялося спалучаць вучобу ў вячэрняй школе з работай у полі. «Замінаў» маладому паляводу старшыня рэвізійнай камісіі Васіль Ігнатавіч Строк. Ён пацікаваў, колькі часу за дэмабілізаваным матросам і прыстаў да старшыні калгаса, бы тая смала:

— Аддай мне яго ў памочнікі. Дужа чэсны хлопец. На яго, як на сябе, спадзявацца магу.

Пазней старшыня рэўкамісіі, самы паважаны і, як лічылі ў вёсцы пагалоўна ўсе, самы справядлівы чалавек, не раз прызнаваўся, што хацеў вырасціць сабе дастойную змену. Ён шчыра шкадаваў і радаваўся адначасова, калі Віктар, скончыўшы школу, паступіў вучыцца ў Пінскае СПТВ-28 меліяратараў. Не хто іншы, а якраз ён, Васіль Ігнатавіч Строк, першым з вясковых старажылаў, сустрэўшы яго на вуліцы пасля вучобы, сказаў тыя запаветныя для Шапавалава словы:

— А ўсё-такі ты малайчына Паўлюкоў сын,— і тут жа паправіўся:— Віктар Паўлавіч.

Будзь заўсёды такім — чэсным, працавітым. Тады шмат чаго даб'ешся ў жыцці.

У жыцці кожнага чалавека бывае гэтая цудоўная і незабыўная пара. Да кожнага яна прыходзіць па-свойму, сваімі сцежкамі-дарожкамі. Пэўна, таму яна і бывае такой жаданай, што наперад не ведаеш, дзе, на якіх скрыжаваннях сустрэнеш яе, і беспамылкова пазнаеш: гэта — яна.

Дзіва, дый годзе! Да Віктара Паўлавіча яна завітала таксама ў дождж. Не ў такі, як цяпер за кабінай экскаватара, а ў ціхі вясенні дождж, які не столькі мочыць, колькі сушыць.

У Калазубах была такая завядзёнка: у нядзелю, калі занягодзіць, хлопцы і дзяўчаты збіраюцца ў каго-небудзь з вяскоўцаў у хаце, спяваюць песні, жартуюць. Часцей за ўсё збіраліся ў Міхаіла Строка, чалавека памяркоўнага і добразычлівага. Да таго ж, у яго былі свой сын — жаніх Міця і дачка на выданні. Так што моладзь тут любілі. Прыйшоў у Строкаву хату і Шапавал. Хлопцы накінуліся на яго з роспытамі аб прафесіі меліяратара, прасіліся ў напарнікі, дзяўчаты ж маўкліва пазіралі на зграбную постаць нядаўняга марака, яго смуглявы, абветраны твар і чорную як смоль шавялюру.

Вызначаць годнасць хлопцаў — адвечны дзявочы клопат. Сцвярджаюць, што пад увагу бярэцца літаральна ўсё — знешнасць, характар, нават дадатныя і адмоўныя рысы бацькоў. Праўда, кожнае дзяўчо пры гэтым занятку падыходзіць са сваёй меркай — справа густу, але ж у канчатковай ацэнцы, як правіла, супрацьлеглых меркаванняў не бывае. Пра ацэнку Шапавала можна было здагадацца па той ціхмянасці, якая ўсталявалася сярод дзяўчат, як толькі ён пераступіў парог. Ад гэтага яму было ніякавата і хацелася як скарэй развеяць яе, вярнуць рознагалосай сябрыне добры настрой.

Выручыла маладая гаспадыня Строкавай хаты — дачка Міхаіла Вольга. Віктар мала што не жахнуўся: калі яна паспела вырасці? Адыходзіў у армію — маленькай, здавалася, была.

А цяпер — на табе: красуня. Ды ўвішная такая стала, гаваркая.

— Штой-та вы, дзяўчаткі, прыціхлі? — насупіла бровы Вольга.— Няўжо Віктара спужаліся?

— А чаго яго пужацца? — загамапілі, заўсміхаліся дзяўчаты.— Мы ж яго ведаем як аблупленага. Хай ён пужаецца: нас вунь колькі, а хлопцаў хоць ты напраўду на покуць валі, каб усім відаць былі.

— Тады давайце паспяваем,— прапанавала Вольга. Дзяўчаты заспявалі песню, якую Шапавал ведаў бадай што з калыскі:

Я каліну-маліну ламіла,
Я каліну-маліну ламіла,
На каліне вячэру варыла.

Які гэта неацэнны скарб — простая і ў той жа час задушэўная народная песня! Яна ўвабрала ў сябе — рупліва і на вякі — не толькі непаўторны каларыт роднай мовы: у свае дзівосныя мелодыі яна шчодра ўпляла ўсе гукі роднай зямлі, усю прыгажосць бацькоўскага краю, мудрасць народа, яго сардэчнасць і прастату.

Сядзем, мілы, з табой на парозе,
Сядзем, мілы, з табой на парозе.
Раскажы, што ты чуў у дарозе.

Як і ў кожнай іншай, у гэтай песні было нешта сваё, адметнае. Напачатку яна лілася нетаропка, спакваля, як плыткія рачулкі ў зарасніках вербалозу, а далей, пры паўторы першага радка, песня шырока распраўляла крылы, узлятала ўвысь і гучала магутна і горда, як векавечны бор у навальніцу.

Нехта з хлопцаў не стрываў:

— Збегаць па гармонік, ці што? Далібог жа, ногі свярбяць.

Вольга, міла ўсміхнуўшыся, запярэчыла:

— Позна ўжо, хлопцы. Давайце другім разам патанцуем.

З ёй усе пагадзіліся. Адно Шапавал, развітваючыся, пашкадаваў:

— А я хацеў было з табой польку тупнуць.

— Другім разам, Віця. Позна ўжо, нашы супачыць хочуць. Другім разам.

І ён быў — гэты другі раз. Потым пяты. Соты...

Цяпер, у кабіне экскаватара, яму зноў прыгадаўся той незабыўны вечар, і на сэрцы, як і тады, стала светла і радасна. Якое шчасце, што ён не прайшоў міма Строкавай хаты! Даўно забылася — як ён заходзіў туды, а вось як выходзіў, будзе помніцца заўсягды. З таго самага вечара ён нідзе і ніколі не адчуваў сябе ў адзіноце. Поруч была яна, яго лепшая ў свеце «каліна-маліна». І будзе. На ўсё жыццё.

Жыццё не песціла маладых. Так сталася, што ў хаце ў Шапавалаў адразу сабраліся чатыры нявесткі. Здавалася б, ад згрызоты сцены павінны былі хістацца. А тут такі лад, такая згода — вадой не разальеш. Як возьмуцца што рабіць — адно дзяржыся. Адно аднаму вады не замуцяць.

— Малайцы Паўлюковы хлопцы,— хвалілі вяскоўцы.— Чэснае слова, павучыцца трэба.

Праз год пасля вяселля Віктар і Вольга адзначылі нараджэнне свайго першынца — дачкі Таццянкі. Віктару здавалася, што цяпер, стаўшы бацькам, ён упершыню па-сапраўднаму ўгледзеў навакольны свет. Услед за гэтым пачуццём з'явілася нейкая асаблівая, неадольная прага да жыцця і дзейнасці. Працаваць яго паслалі спачатку ў Пружанскі раён, потым перакінулі ў Ляхавічы (там разгортваўся шырокі фронт работ па асушэнню балот), але вандроўніцкае жыццё толькі падбадзёрвала маладога меліяратара, надавала імпэту.

І тут — новая радасць: нарадзіўся сын Сяргейка. Кажуць: дзеці — кветкі жыцця. Чыстая праўда. Але ж яны яшчэ і непагаснае святло ў нашых вокнах. Святло незвычайнае — поклічнае, як нішто іншае, шчодрае на пяшчоту. Дзе б ты ні быў, што б ні рабіў — яно з табой.

Ці ведаеце вы, пра што думае машыніст экскаватара, калі ён дзень пры дні (да таго ж многа гадоў запар) не выпускае з рук рычагі паслухмянай машыны? Правільна, пра ўсё думае: пра планы і абавязацельствы, пра гонар калектыву і высакароднасць сваёй місіі, пра сяброў-таварышаў і пра многае іншае. Усё ж заклікаю паверыць Віктару Паўлавічу Шапавалу: «Не думаць можна пра што заўгодна, толькі пра дзяцей не думаць — ну, аніяк нельга».

І думкі бягуць бясконцай чародкай — адна за адной, адна за адной. Сотні надзей. Тысячы пажаданняў. Безліч імкненняў. І такіх, што ўзнімаюць высока-высока, адкуль як на далоні паўстае яго вялікасць дваццаць першы век. І такіх, што імгненна ледзяняць душу.

«Таня і Сяргейка, калі вы станеце вялікімі, вам абавязкова захочацца як мага больш даведацца пра бацьку. Якім быў? Што любіў? Да чаго імкнуўся? Адказаць на гэта зусім нескладана. Відаць, мой самы вялікі недахоп у тым, што я не люблю гаварыць пра сябе. Ва ўсім нашым родзе не было такога, хто б любіў залішне мянташыць языком. Затое ўсе ў нас любілі зямлю, любілі працаваць на ёй, жылі сваім розумам, са свайго мазаля і не любілі таўчыся пад нагамі ў астатніх. Сяброў выбіралі раз і назаўсёды. Прафесію — таксама. Брат Іван пажадаў стаць трактарыстам — стаў ім. Васілю даспадобы была работа электрыка — дамогся свайго. Аляксею, яшчэ як быў падлеткам, сніліся аўтамашыны, і таму не дзіўна, што шафёрскую справу ён не прамяняе цяпер ні на што на свеце. Сястра Зіна яшчэ школьніцай крадком бегала на ферму, палюбіла работу даяркі і лічыць яе самай лепшай. Другая сястра, Вера, назаўсёды звязала свой лёс з паляводствам. Спытаеце: што прывяло мяне ў меліярацыю? Усё тая ж любоў да зямлі. Жаданне бачыць яе дагледжанай. Ну, а якім быў ваш бацька, можна адказаць адным словам: быў камуністам. Радавым партыі вялікага Леніна. Вось пра гэта і хочацца сказаць мне самому, бацьку...»

І думкі бягуць далей бясконцай чародкай — адна за адной, адна за адной. То водзяць па сцежках маленства — узберагам ціхай Вулачкі, то сігаюць на Балтыку — на неабсяжны марскі прастор, то зноў вяртаюцца ў дзень сённяшні ці ў недалёкую будучыню, і тут ужо ніяк не абысціся без непагаснага святла ў нашых вокнах — дзяцей.

«Таня і Сяргейка, апошнім часам я ўсё часцей думаю пра свайго бацьку, вашага дзеда Паўлюка. Некалі ён вучыў мяне араць, касіць, сеяць. Вучыў, як ён любіў гаварыць, быць чалавекам. Паслухайце, як гэта гучыць: быць чалавекам! Я спытаў у яго: «А што гэта азначае?» Ён хвілінку падумаў і адказаў: «Гэта і азначае... быць чалавекам». Потым кашлянуў у кулак і дадаў: «Гм-м, адразу ўсё не растлумачыш. Тут сэрцам зразумець трэба. Я сам мяркую так: каб быць чалавекам, трэба потам і крывёю прыкіпець да сваёй зямлі». Адно ў час службы на флоце я зразумеў: бацька вучыў мяне любіць Радзіму. Вучыў усім сваім жыццём, прама не гаворачы аб гэтым. Любоў да Радзімы — асаблівая любоў, ні з чым не параўнальная. Яна жыве ў сэрцы чалавека. І калі ў сэрцы няма месца для такой любві, лічыце, няма чалавека».

Не было яшчэ і дзвюх гадзін ночы, як вецер неяк знячэўку, непрыкметна знябыўся, аслаб. Неўзабаве сціхнуў дождж, і на цёмным небе паміж разрывамі хмар дзе-нідзе прыветна замігацелі па-летняму буйныя зоркі. Шапавал разоў колькі вылазіў з кабіны — аглядаў машыну, кратаў нагою грунт каля гусеніц, потым, супакоены, ямчэй масціўся ў цеснаватай кабіне свайго экскаватара «Э-304», вырашыўшы дачакацца світанку. Хацелася задрамаць, але сон не ішоў. Чамусьці прыгадалася, што яму ўжо другі раз даводзіцца з-за дажджу начаваць у кабіне экскаватара.

Першы раз гэта здарылася даўнавата — га-

доў дзесяць таму назад. Працаваў ён кіламетраў за трыццаць з гакам адсюль, на аб'екце «Макава». Яму толькі што даверылі тады першы ва ўпраўленні меліярацыі магутны кубавы экскаватар «Э-10011». Так атрымалася, што за месяц работы Віктар Паўлавіч выканаў на ім дзве месячныя нормы. Паглядзець на работу Шапавала завітала начальства. Прыехаў галоўны інжынер упраўлення Аляксей Дзмітравіч Козараў, чалавек такі душэўны, што з ім было прыемна не толькі пагаварыць — пастаяць поруч. Разам з ім прыйшоў сюды, на Макаўскае балота, сакратар партыйнай арганізацыі БМУ меліярацыі Васіль Пятровіч Якімовіч, строгі і патрабавальны да ўсіх і кожнага, а ў першую чаргу да самога сябе. Прывёў іх на аб'ект прараб участка Уладзімір Іванавіч Сівуха, спакойны, разважлівы і вельмі ж працавіты меліяратар; гэта пра яго гаварылі на ўсіх участках упраўлення: «Апантаны прараб: сам без справы не пасядзіць — і астатнім не дасць». Цэлага паўдня яны рабілі нешта накшталт хранаметражу работы Шапавала, потым паклікалі машыніста да сябе, і Козараў здзіўлена ўзняў бровы:

— Скажы, Віктар Паўлавіч, няўжо гэта магчыма ў нашых умовах?

— Што магчыма? — не зразумеў Віктар Паўлавіч.

— Ну, эканоміць час на кожным цыкле экскавацыі?

— А-а,— зразумеў Шапавал.— Выходзіць, што магчыма.

— Тады растлумач мне, раскладзі ўсё па палічках.

Шапавал доўга і старанна расказваў і паказваў, як «прымеркаваўся» працаваць на новай машыне (пра вопыт гаварыць ён яшчэ саромеўся), а калі скончыў, Козараў рашуча махнуў рукой:

— Праз два дні прывязу сюды ўсіх машыністаў экскаватараў. Будзеш вучыць іх працаваць па свайму метаду.

Прывезці ён сапраўды прывёз усіх, толькі ў той дзень, мякка кажучы, адняў у Шапавала ладны абярэмак часу. Развітаўшыся з гасцямі, Віктар Паўлавіч настолькі прыналёг на рычагі, што не заўважыў, адкуль наляцелі чорныя навальнічныя хмары, з якіх на ўсю ноч як з вядра лінуў халаднаваты асенні дождж. Ён і тады не звёў вока. Праўда, думалася той раз найбольш пра работу.

Што ж усё-такі ў ёй галоўнае? Што забяспечвае поспех? Магутная тэхніка? Вядома ж, яна таксама. А што самае галоўнае? Хай гэта не прагучыць наіўна, самае галоўнае ў рабоце экскаватара — яго рукі. Машыніст экскаватара не бачыць сваіх рук. Уся яго ўвага скіравана на коўш, на трасу будучага канала. Кожны дакладны рух рук (а гэта азначае каўша, усёй машыны) павінен быць як мага больш эфектыўным і рацыянальным. Пры экскавацыі машыністы, кожны па-свойму, імкнуцца эканоміць час — дзесятыя долі секунды. І тыя, каму гэта ўдаецца, дабіваюцца поспеху. У практыцы Шапавала эканомія часу дасягаецца шляхам сумяшчэння вытворчых аперацый усяго працоўнага цыкла. Паварот напоўненага каўша машыніст сумяшчае з пад'ёмам, выгрузку — з паваротам, а наступны паварот — з чарговым апусканнем каўша. Эканомяцца секунды, за змену яны ўтвараюць мінуты, а гэта ў сваю чаргу дае дзесяткі кубаметраў дадаткова выкінутага грунту. Яшчэ больш эканоміцца часу па меры прасоўвання экскаватара ўперад — пасля ачысткі канала па ўсяму сячэнню. Існаваўшая раней практыка — спачатку апусціць стралу, потым уключыць перадачу і толькі пасля ад'язджаць на патрэбную адлегласць — Шапавалам амаль што не прымянялася. У яго свая сістэма. І даволі-такі ўдалая. Уявіце сабе: з паварота выгрузкі каўша ўключаецца пад'ёмная лябёдка, тут жа растармажваюцца гусеніцы, рычаг з павароту ўключаецца на ход і — справа зроблена: экскаватар на новым месцы. На рахунку новыя дзесяткі, а часам нават сотні сэканомленых се-

кунд. Калі ж улічыць, што за змену экскаватар робіць па 70—80 такіх пераездаў, выгода відавочная.

Яшчэ больш відавочная яна, падсумаваная за тыдні, месяцы, гады. Тут дарэчы будзе прыгадаць толькі адну лічбу: за восьмую пяцігодку Віктар Паўлавіч выканаў сем гадавых норм. Радасны вынік! Удвая радасны ён таму, што дасягнута гэта было ў найскладанейшых, найцяжэйшых умовах, пра якія можна расказваць бясконца. Адно на сланях (самы цяжкі варыянт экскавацыі) машына Шапавала адмерала, прынамсі, не адзін дзесятак кіламетраў па багністых балотах. Самаадданая праца меліяратара была адзначана высокай узнагародай Радзімы — ордэнам Леніна. Новая радасць! Працоўныя Ганцавіцкага раёна аднагалосна выбралі яго дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Яшчэ адна радасць!

Сцвярджаюць: не забываюцца толькі крыўды. Няпраўда. Радасці таксама не забываюцца. Ні праз год, ні праз дзесяць. Шкада, аднак, што ёсць яшчэ людзі, якіх радасць працоўнага поспеху часам расхаладжвае. У Шапавала ўсё наадварот. Радасці акрылялі яго, памнажалі сілы. У сваім новым сацыялістычным абавязацельстве ён запісаў: «За гады дзевятай пяцігодкі абавязуюся выканаць два пяцігадовыя планы».

Планы даўно сталі нормай нашага жыцця. З імі не проста зручней, з імі цікавей і радасней працуецца, надзейней жывецца. Трапна нехта сказаў: план — закон.

У меліяратараў асаблівыя планы. Колькі б там ні ўвіхаліся праекціроўшчыкі, самых розных рангаў эканамісты, на практыцы часам атрымліваецца не ўсё гэтак гладка, як на паперы. І нічога ў гэтым дзіўнага няма: прырода, відаць, яшчэ доўга будзе падкідваць меліяратарам свае загадкі і капрызы. Але ж план ёсць план, яго неабходна выконваць. І выконваць не абы-як, а якасна.

На меліярацыйным аб'екце капрызы надвор'я асабліва адчувальныя. У дзевятай пяцігодцы, шчыра кажучы, не было ніводнага года, калі б надвор'е спрыяла меліяратарам. Калі не вясной, дык улетку ці ўвосень залівалі дажджы. Зімою маразы не скоўвалі балоты, і разлічваць на палёгку ў пракладцы каналаў цераз дрыгву не прыходзілася. Словам — не адно, дык другое. Прычым такое становішча назіралася літаральна на ўсіх аб'ектах: на «Вярхоўі ракі Цна», на другой чарзе рыбгаса «Лактышы», у Задуб'і і Люсіне, на будучых разлогах саўгаса «Адраджэнне» — скрозь.

І ўсё ж меліяратары выканалі свае планы. Толькі гаспадаркам Ганцавіцкага раёна за гады дзевятай пяцігодкі было перададзена каля 10 тысяч гектараў асушаных зямель.

Да таго ж на плошчы амаль у восем тысяч гектараў былі праведзены культуртэхнічныя работы, створана небывалая для тутэйшых месц паша...

Кабіна экскаватара. Цеснавата ў ёй удвух. І калі ты на прамілы бог упрасіўся нішкам прымасціцца ў самым кутку гэтай кабіны, цябе ні на хвіліну не пакіне нейкае больш чым няёмкае пачуццё: ты замінаеш экскаватаршчыку. Затое адно тут, у кабіне, ён адкрыецца перад табой як на духу. І ты без лішніх тлумачэнняў зразумеш, чаму ў Віктара Паўлавіча такая важкая паходка — паспрабуй дзень пры дні восем гадзін запар арудаваць нагамі па сталёвых педалях, якія нават і ў цемрадзі свецяцца, быццам шкельцы на сонцы. І зусім па-іншаму адчуеш, здароўкаючыся за руку, шурпатасць яго далоні і жахнешся, утрапёны, ад раптоўнай думкі, што недзе бачыў чалавека, у якога на ступні скура намнога мякчэй, чым на далонях экскаватаршчыка. Тады, як гэта цяпер гаворыцца, да канца «ўсячэш» сабе, чаму спрадвеку стрыманыя і па-свойму хітрыя дзядкі з Люсіна, Макава і Палоні на руках выносілі яго з гэтай цеснаватай кабіны і, ніколечкі не саромячыся, цалавалі па-мужчынску няўмела і смешна. Ца-

луюцца мужчыны — ведайце: гэта ад душы, без усялякай падробкі на шчырасць; за здароў жывеш мужчына гэта не зробіць. Яго ж, Віктара Паўлавіча Шапавала, сапраўды было за што цалаваць: за дзевятую пяцігодку ён выканаў дванаццаць гадавых норм. Яму, дэлегату XXV з'езда КПСС, за гэты працоўны подзвіг было прысвоена ганаровае званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Так, цеснавата ў кабіне экскаватаршчыка. Не надта каб высока яна над зямлёй, і ўсё ж бачна з яе далёка-далёка. Найперш бачацца знаёмыя мясціны, дзе давялося першаму пракладваць магістральныя каналы. Цяпер там палі. Раздолле — як акінуць вокам. У калгасе «Рассвет» на іх збіраюць па 60 цэнтнераў ячменю з кожнага гектара пасеву, у «Сцягу Леніна» — да 50 цэнтнераў «міронаўкі», у «Расіі» — па 380 цэнтнераў бульбы, у «Першым маі»... Дарэчы, неяк Шапавал спытаў у старшыні праўлення гэтай гаспадаркі Паўла Карпавіча Шуляка:

— Расце, Карпавіч, хлеб на балоце?

Шуляк хлопец мясцовы, просты і бясхітрасны, гаворыць толькі тое, што думае.

— Засыпаліся хлебам, братка ты мой! — адказаў старшыня, і твар яго засвяціўся ўсмешкай, ціхай і светлай.

Сонечнай раніцай Віктар Паўлавіч вяртаўся з аб'екта дамоў. Пасля начнога ліўня зямля не паспела яшчэ ўвабраць усё мноства вільгаці, і на палявой дарозе, як зашклёныя, скрозь зіхацелі невялікія лужыны. Ён наўмысна збочыў з бальшака і пайшоў гэтай дарогай: карцела як хутчэй даведацца, ці не палеглі пад ліўнем пасевы азімага жыта. Ад самой вясны на гэтых участках увіхаліся дзве жанчыны — аграномы з упраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкома. Шапавал добра ведаў іх абедзвюх, глыбока паважаў за няўрымслівасць у рабоце. Яны хваліліся, што прымяняюць новы прэпарат «ТУР» — спецыяльна ад палягання збажыны.

З галавы не выходзіла думка: «Ці будзе які толк з гэтага прэпарата?»

На ўскрайку жытнёвага поля ён запаволіў хаду, пільна ўзіраючыся перад сабой. Уздоўж перапоўненага вадой меліярацыйнага канала, як чарот, непахісна стаяла магутнае жыта. Ён нават пакратаў яго рукою. Вільготныя каласы даверліва леглі на яго шурпатыя далоні.